## АФАРМЛЕННЕ ІНСТЫТУТА АДВАКАТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў XVI ст.

***І. А. Доўнар***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Узнікненне інстытута адвакатуры ў Беларусі з’яўляецца адным з важных і яшчэ недастаткова даследаваным пытаннем гісторыі права, хаця ўжо ў XVI ст. акрамя ранейшай адвакатуры, якая дзейнічала на падставе магдэбургскага права ў гарадах, складваецца адвакатура, функцыяніраванне якой рэгламентавалася статутамі. Месца яе дзейнасці – земскія суды і Гаспадарскі суд, пазней – Галоўны суд (Трыбунал).

Замест прынцыпу асабістага выступлення на судзе сам Вялікакняжацкі суд прапаноўваў даручаць справу каму-небудзь, калі нельга асабіста з’явіцца на суд. Часцей за ўсё прадстаўнікамі на судзе выступалі родзічы. Праводзілі судовыя справы і так званыя «служэбнікі» ад імя сваіх паноў. Рознага роду аб’яднанні фізічных асоб (напрыклад, гарадскі цэх), як правіла, наймалі прафесійных адвакатаў (пракуратараў). Аднак адвакатура тады яшчэ толькі зараджалася і была ў неаформленым стане. Закон спачатку ўвогуле не датыкаўся пытання аб замене боку на паверанага, але судовыя працэсы сведчаць аб іншым. Адвакаты выступалі як па грамадзянскіх, так і па крымінальных справах. Яны дапамагалі істцам і адказчыкам з’явіцца на суд належным чынам падрыхтаванымі.

Функцыі абаронцаў і памагатых пры вядзенні справы выконвалі ў розны час розныя асобы: дзякі, пісары, прыяцелі, службоўцы і проста шляхціцы. Трэба адзначыць, што вельмі часта духоўныя асобы карысталіся непісьменнасцю людзей і дапамагалі ім у судовых справах за грошы. Яны пісалі скаргі, складалі пэўныя акты. Дарэчы, складанне завяшчальных запісаў увогуле здаўна знаходзілася ў руках духавенства. Большасць дзякоў – дваране, якія выконвалі даручэнні ў вялікакняжацкай канцылярыі.

Спачатку новы інстытут быў характэрным больш для Гаспадарскага суда, куды часцей за ўсё звярталіся радавітыя феадалы. А ў мясцовых судах працэс ішоў больш без прадстаўніцтва. Аднак паступова адвакаты пачалі дзейнічаць пры гродскіх і земскіх судах, а таксама пры Галоўным Судзе. У сувязі з тым, што колькасць іх пры кожнай з гэтых устаноў не рэгламентавалася, а прыбытак яны мелі добры, адвакатаў з цягам часу стала нават занадта многа. Закон пачынае звяртаць увагу на гэта і патрабаваць, каб імі былі толькі шляхціцы, якія ведалі мясцовае права і былі дапушчаны судом да адвакацкай дзейнасці.

Адвакаты былі вядомы на Беларусі з даволі даўніх часоў. Аднак упершыню закон гаворыць пра іх у Статуце 1529 г., дзе меўся артыкул, які забараняў «чужаземцам» быць адвакатамі, што азначае, што адвакаты ўжо існавалі. Пра іх гаварылася потым у пастановах сойма. Так, згодна пастанове 1543 г. адвакат павінен быў выслухаць бок і адкрыта выказаць сваю думку па судовай справе. Пастановы сойма абавязвалі іх дзейнічаць высакародна, прытрымлівацца закона. Аб гэтым жа гаварыў і Статут 1588 г., які дастаткова вызначыў асабістую адказнасць адваката за вядзенне справы і кампенсацыю панесеных бакамі страт. Закон 1638 г. абавязаў адвакатаў старацца хутчэй закончыць справу, сумленна выконваць свае абавязкі, не адмаўляцца ад прынятай ім справы, не здраджваць на карысць супраціўнага боку.

Увогуле паўнамоцтвы адваката былі дастаткова шырокімі. Статут 1588 г. больш дакладна рэгламентаваў статус адвакатаў, а самае галоўнае – вызначаў адказнасць за нядбайнае вядзенне справы. Напрыклад, адвакат караўся турэмным зняволеннем на 4 тыдні і аплатай усіх страт, якія па яго віне панёс падапечны. Асабліва жорстка караліся пракуратары за няяўку на працэс без слушных прычын. Так, Статут прадугледжваў пакаранне смяротнай карай абаронцы, які не з'явіўся на суд, сказаўшыся хворым, а на наступным судовым пасяджэнні не згадзіўся прысягнуць пра сваю хваробу.

Такім чынам, інстытут адвакатуры на Беларусі мае старажытнае паходжанне. Яго развіццё і заканадаўчая рэгламентацыя ў XVI ст. сталі адной з характэрных рысаў судовай рэформы.